Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ КЛАССЫ: ОПЫТ И ПЕРСПЕКТИВЫ

*Сборник материалов*
*II Республиканской научно-практической конференции*

Минск
БГПУ
2017

Учебно-издательский центр БГПУ
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 377.8
ББК 74.5
П24

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ,
рекомендовано секцией педагогических наук (протокол № 7 от 18.12.17)

Р е ц е н з е н т ы:
*А. В. Торхова*, доктор педагогических наук, профессор,
проректор по научной работе учреждения образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»;
*В. Ф. Русецкий*, доктор педагогических наук, доцент,
начальник научно-исследовательского центра
НМУ «Национальный институт образования
Министерства образования Республики Беларусь»;
*И. А. Царик*, кандидат педагогических наук, доцент,
и. о. заведующего кафедрой педагогики
факультета социально-педагогических технологий
учреждения образования «Белорусский государственный
педагогический университет имени Максима Танка»

**Педагогические** классы: опыт и перспективы: материалы II Республи-
П24 канской научно-практической конференции, г. Минск, 3 ноября 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; под ред. А. И. Жука, А. В. Позняк. – Минск : БГПУ, 2017. – 325 с.
ISBN 978-985-541-541-406-4.

В сборнике обобщен опыт работы профильных классов / групп педагогической направленности в Республике Беларусь и определены перспективы педагогической профилизации в учреждениях общего среднего образования.

Адресуется педагогам, специалистам отделов и управлений образования, курирующим организацию профильной педагогической подготовки на III ступени общего среднего образования, всем заинтересованным лицам, педагогическим работникам, занимающимся вопросами непрерывного педагогического образования, профильной и допрофильной педагогической подготовки учащихся.

УДК 377.8
ББК 74.5

ISBN 978-985-541-406-4

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МАЙСТЭРНЯ «ЖЫВАЯ БІБЛІЯТЭКА – НОВЫ ФАРМАТ ЗНОСІН У АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ»

***І. П. Ганісеўская***
*ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Слоніма»*

**Анатацыя.** Пакаленне сённяшніх вучняў адчувае праблему ў наладжванні жывых стасункаў, міжасобасных камунікацый у паўсядзённым жыцці. Рашэнню гэтай праблемы station спрыяе атмасфера мерапрыемстваў, наладжаных праз фармат Жывой Бібліятэкі.Гэта ідэя інавацыйных зносін адаптавана для аўдыторыі любога ўзросту, можа быць выкарыстана як адна з форм профільнай і дапрофільнай падрыхтоўкі вучняў.

**Тэма. Настаўнік: у адзінстве практыкі і творчасці.**

**Педагог-майстар:** настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Слоніма» Ірына Пятроўна Ганісеўская.

**Працягласць:** 45 мінут.

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў у сферы арганізацыі мерапрыемстваў, арыентаваных на развіццё міжасобасных камунікацый.

**Задачы:**

- пазнаёміць удзельнікаў з прынцыпамі арганізацыі мерапрыемстваў у фармаце Жывой Бібліятэкі;
- стварыць умовы для творчага каманднага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў майстар-класа;
- матываваць да засваення вопыту Жывой Бібліятэкі і прымянення яго ва ўласнай практыцы.

**Форма правядзення:** педагагічная майстэрня.

**Форма арганізацыі:** групавая (удзельнікі адвольна дзеляцца на чатыры групы па 5–6 чалавек у кожнай).

**Аўдыторыя:** настаўнікі, класныя кіраўнікі, вучні.

### *Ход майстэрні*

1. **Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

(Знаёмства майстра з удзельнікамі майстэрні)

2. **Абгрунтаванне праблемы**

**Майстар.** Кожны чалавек, як кажуць, пры нараджэнні адкрывае сваю ўласную кнігу жыцця. За час, што ён жыве, гэтая кніга расце, узбагачаецца, у яе дадаюцца новыя старонкі, тэкст і ілюстрацыі, мяняецца вокладка…

У наш час гаджэтаў мы, настаўнікі-філолагі, як ніхто іншы, разумеем і са шкадаваннем заўважаем, што пакаленне сённяшніх вучняў, наша моладзь адчувае ў рэальнасці праблему ў наладжванні жывых стасункаў, міжасобасных

камунікацый у паўсядзённым жыцці. Яны лёгка кантактуюць, аб'яднаныя living рознымі групоўкамі ў сацыяльным сеціве, але многім з іх часам цяжка ўступіць у жывы дыялог, абмяняцца думкамі з вока на вока. У рэшце-рэшт, многія проста не ўмеюць ці не прывучаны слухаць іншых, прыняць ці не, прымерыўшы да сябе, пазіцыю другога.

Як дапамагчыператварыць, вобразна кажучы, наша вучнёўскае і моладзевае грамадства з адасобленых «сховішчаў» у велізарную залу, дзе многія змогуць пазнаёміцца, зробяць крок да таго, каб зразумець адзін аднаго, і паспрабуюць прыняць пункт погляду іншага, інакш кажучы, навучацца ўспрымаць «кнігі» з іншых «стэлажоў»?

Гэтаму станоўча спрыяе атмасфера стасункаў, наладжаных праз фармат так званай Жывой Бібліятэкі, стварыць якую мы сёння з вамі зможам на дадзеным мерапрыемстве.

**3. Вызначэнне тэмы, мэты і задач майстар-класса**

**Майстар:** Тэма Жывой бібліятэкі «Настаўнік: у адзінстве практыкі і творчасці» .

Вы пачуеце выказванне, закончыць якое, некалькі хвілін абдумаўшы, я папрашу вас: «Дадзенае мерапрыемства будзе для мяне карысным, таму што ...».

Дазволю сабе выказаць упэўненасць, што нашы зносіны падчас працы будуць прадуктыўнымі і пройдуць у рэжыме высокай актыўнасці.

**4. Актуалізацыя суб'ектнага вопыту ўдзельнікаў**

**Майстар:** Падніміце руку тыя, хто ўжо знаёмы з такім фарматам зносін. Дзякуй. Я спадзяюся, што вы без сарамлівасці будзеце мяне дапаўняць і станеце важным звяном унутрыгрупавых стасункаў.

**5. Даведачная інфармацыя**

**Майстар:** Усім вядома выказванне пра тое, што часта новае – гэта добра забытае старое. Тое ж можна сказаць і пра Жывую бібліятэку. Паспрабую вас у гэтым пераканаць.

У старажытным Рыме багаты гандляр збіраў у сваім палацы знакамітых гасцей, вёў прыёмы, але з прычыны недастатковай чытацкай граматнасці і беднага слоўнікавага запасу не мог весці змястоўных гутарак. І вырашыў ён гэтую праблему наступным чынам. Па загадзе гандляра адабралі дзвесце больш-менш граматных рабоў і прымусілі кожнага з іх вывучыць на памяць адну кнігу, сюжэт якой рабы пераказвалі ўслых масцітым гасцям падчас прыёмаў. Гэта было не што іншае, як Жывая Бібліятэка.

У наш час Жывая Бібліятэка – гэта міжнародны праект, які падтрымлівае Савет Еўропы. У праекце ўдзельнічае больш за 200 краін, уключаючы нашых суседзяў, Расію і Польшчу. Пастулова набірае папулярнасць такі праект і ў Беларусі. А першая такая Жывая Бібліятэка была арганізавана ў Даніі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў 2000-м годзе сіламі падлеткаў, якім і належыць дадзеная ідэя. Сёння Жывыя Бібліятэкі прыходзяць ва ўстановы адукацыі.

Такая бібліятэка вельмі падобная да звычайнай, толькі ролю «кнігі» ў ёй выконваюць цікавыя людзі, асобы са сваім непаўторным жыццёвым вопытам, і яны гатовы цікава расказаць пра сябе чытачам. Чытачы – удзельнікі мерапрыемства. Бібліятэкар – арганізатар, які кантралюе працэс, адказвае на пытанні. Чытанне тут замяняе жывая размова, пытальна-адказальныя стасункі і дыялогі.

Такі фармат зносін дазваляе адчуць атмасферу адкрытасці. І, што важна зазначыць, падчас гутаркі-чытання не бывае няправільных альбо няважных пытанняў, як і адказаў, кожнае пытанне важнае і кожны адказ з боку «кнігі» правільны.

Агульныя правілы Жывой Бібліятэкі такія: у чытача (чытачоў) ёсць пэўны адрэзак часу на тое, каб даведацца ў «кнігі» пра ўсё, што ён хоча, гэта значыць «пачытаць кнігу». Пасля гэтага ён вяртае «кнігу» ў фонд Бібліятэкі і можа выбраць для чытання другую (адбываецца сустрэча з новай асобай).

## 6. Інструктаж перад практычнымі заняткамі

**Майстар:** У адкрытым фондзе нашай Жывой Бібліятэкі сёння 3 «кнігі» з багатымі дадаткамі.

Першая «кніга», якую хачу прадставіць, называецца «Дзіўныя гісторыі простых рэчаў». Аўтар – Ніна Міхайлаўна Анішчык, выкладчык гісторыі, арганізатар музея ў межах уласнай кватэры.

Інтрыгуючая назва ў наступнай «кнігі» ад творчага і апантанага любоўю да сваёй прафесіі і роду заняткаў чалавека, педагога Наталлі Васільеўны Лашчэўскай – «Творчасць пачынаецца з працы». Як бачыце, гэтая «кніга» таксама з багатым дадаткам.

І трэцяя «кніга» з фондаў нашай Жывой Бібліятэкі носіць назву «Свет мастацтва не просты». Гэтая «кніга» ад Марыны Вячаславаўны Валадковіч, педагога па вакале, чые выхаванцы адзначаны дыпломамі на рознага роду конкурсах. «Кніга» «Свет мастацтва не просты» з музычным дадаткам.

Правілы працы ў Жывой Бібліятэцы наступныя. Кожная група «чытае кнігу» 15 хвілін. Чытанне напачатку ўключае ў сябе невялікі ўступ ад самой «кнігі». Паступова адбываецца пераход да чытання-дыялогу паміж чытачамі і кнігай: чытачы могуць спытаць у кнігі аб усім, што іх па ходзе чытання цікавіць.

Пачытаўшы першую «кнігу», па гукавым сігнале (званочак) група чытачоў пераходзіць (па стрэлцы гадзінніка) да другой «кнігі». Так чытаем 3 кнігі.

Прадугледжваю, што часу на поўнае прачытанне асобнай «кнігі» ў нас будзе недастаткова, але гэта не страшна, бо ў жыцці ж мы кнігі таксама чытаем не за адзін прысест, а значыць, пры жаданні, «перачытаць» ці «дачытаць» тую ці іншую «жывую кнігу» можна другім разам.

Звяртаю ўвагу яшчэ на адну важную акалічнасць: пасля таго, як час, адведзены на «чытанне кніг» выйдзе, у нашай Бібліятэцы сёння будзе арганізавана абмеркаванне прачытанага. Вы зможаце падзяліцца ўражаннямі ад прачытаных «кніг»: чым зацікавіла кніга? што новага даведаліся? і г. д.

**7. Практычныя заняткі з удзельнікамі майстэрні**

Чытанне «кніг» (створаны спакойны музычны фон, майстар адсочвае час).

Абмеркаванне прачытанага (удзельнікі-чытачы дзеляцца ўражаннямі: чым зацікавіла кніга, што новага даведаліся ...).

**8. Падагульненне**

**Майстар:** Вы мелі магчымасць пазнаёміцца з арганізацыяй працы ў фармаце Жывой Бібліятэкі.

Працягваючы працу ў складзе груп, калі ласка, абмяркуйце пытанне «У чым бачацца станоўчыя і адмоўныя бакі фармату мерапрыемства «Жывая Бібліятэка», калі прыстасаваць яго да вашай установы адукацыі?».

Вывады-разважанні адлюструйце ў адпаведнай табліцы (табліцы на сталах груп), прэзентуйце іх, дадаткова агучыўшы.

Праца ў групах па абмеркаванні і запаўненні табліцы.

Прыкладныя адказы, занесеныя ў табліцу ўдзельнікамі груп.

| + | - |
|---|---|
| Магчымасць пабудаваць канструктыўны дыялог паміж людзьмі | Абмежаванасць у часе, адведзеным на чытанне |
| Дапамагае пазбавіцца ад шаблоннасці ў зносінах | Нельга сёння «ўзяць кнігу з сабою» |
| Павышаецца ўзровень узаемаразумення | |
| З'яўляецца магчымасць напрамую сфарміраваць сваё ўяўленне пра асобу | |
| Развіваецца ўменне задаваць пытанні і слухаць іншых | |
| Спрыяе прафесійнаму самавызначэнню і прафарыентацыі | |
| Ёсць магчымасць даведацца пра цікавы жыццёвы вопыт чалавека, узяць урокі жыцця | |
| Інфармацыйнае ўзаемаабагачэнне «кнігі» і чытача | |

**9. Рэфлексія**

**Майстар:** Ці адпавядала мерапрыемства вашым прагнозам, запытам?



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**10. Заключнае слова педагога-майстра**

У заключэнне скажу: такі фармат зносін з лепшымі прадстаўнікамі педагагічнай нівы, педагогамі, выхавальнікамі ўжо вызначаны як адзін з прыярытэтных у напрамку прафарыентацыі.

Паважаныя калегі, удзельнікі майстэрні, спадзяюся, што атрыманы вопыт па правядзенні Жывой Бібліятэкі будзе вамі ўзбагачацца і вы будзеце выкарыстоўваць такі фармат зносін у сваёй працы настаўніка і класнага кіраўніка. Кожны чалавек па-свойму ўнікальны, кожны чалавек – цікавая кніга.